

ГАЗЕТА ДЭМАКРАТЫЧНЫХ ПЛЫНЯЎ ПРЫДЗВІНСКА- ПРЫДНЯПРОЎСКАГА КРАЮ

(20) 22 ліпеня 1992 г. Цана 80 кап.

Віноўнікі жабрацкага стану людзей знаходзяцца ў парламентах, дзе большасць дэпутацкіх мейсцаў належыць былой наменклатуры КПСС

ПАЛІТЫЧНАЯ ЗАЯВА

КАНСУЛЬТАТЫЎНАЙ РАДЫ ДЭМАКРАТЫЧНЫХ ПАРТЫЙ ДЫ РУХАЎ МЕСТА ВІЦЕБСКА

Штодня пагаршаецца і без таго складаны палітычны й гаспадарчы стан у Рэспубліцы Беларусі і іншых краінах СНД.

Скарачаецца вытворчасць, мацнее хаос у грашова-фінансавай сістэме, абвастраюцца міжнацыянальныя канфлікты, быццам лавіна расце злачыннасць, узрастае адчайнае супраціўленне сілаў мінулага, якія не жадаюць зменаў. Апагеям праваканаванага супрацьстаяння з'явіліся маскоўскія падзеі вакол тэлеасяродка «Астанкіна».

Кансультатыўная Рада дэмакратычных партый ды рухаў места Віцебска, прааналізаваўшы сітуацыю, што склалася ў рэспубліцы і ў найбліжэйшым замежжы, лічыць патрэбным заявіць наступнае:

Законадаўчымі і выканаўчымі органамі не прымаюцца і не ажыццяўляюцца рашэнні, якія змяняюць базісныя эканамічныя дачыненні, г. зн. адносіны ўласнасці. Аднак былая наменклатура КПСС здолела стварыць дзеля сябе заканадаўчую аснову, з дапамогай каторай яна кладзе ва ўласныя кішэні дый кішэні сваіх крэўных вялізныя багацці. У выніку непазбежна бяднее бальшыня народа. Падобна на тое, што тыя, хто інспіруе пагромы Астанкінскага тэлецэнтра гэтаксама аказаліся матэрыяльна «абдзеленымі».

Але ж віноўнікі жабрацкага стану людзей знаходзяцца не ў тэлецэнтрах, а ў парламентах, дзе большасць дэпутацкіх мейсцаў належыць былой наменклатуры КПСС. Яна свядома адхіляецца ад прыняцця рэфарматарскіх законаў.

Так, Вярхоўны Савет Беларусі не прымае закон аб прыватызацыі дзяржаўнай уласнасці. Адразу ж быў адвергнуты прапанаваны апазіцыяй БНФ праект Закона аб барацьбе з карупцыяй і злачыннасцю. Няма Закона аб беспрацоўных, настойліва адмаўляецца права ўласнасці на зямлю. Не прымаюцца і іншыя найважнейшыя законы.

Чырвона-карычневыя выдатна разумеюць, што на чарговых выбарах у Вярхоўны Савет выбаршчыкі адмовяць ім у даверы. Вось і спяшаюцца яны распачаць новую грамадзянскую вайну і такім чынам захаваць уладу над народам.

Кансультатыўная Рада дэмакратычных партый ды рухаў места лічыць, што мы падыходзім да той рысы, калі ад кожнага выбаршчыка будзе залежыць, куды пойдзе наша рэспубліка:

да стварэння ўласнага незалежнага цывілізаванага гаспадарства ў еўрапейскім доме ці вернецца да будовы ілюзорнага камуністычнага грамадства з ГУЛАГам за калючым дротам і за жалезным занавесам ад усяго свету.

Давайце ўсе спрэчныя пытанні вырашаць годнымі дэмакратычнымі метадамі. З гэтае прычыны датэрміновыя выбары Вярхоўнага Савета—цывілізаванае выйсце з палітычнага тупіка.

Мы працавітыя, мы ўмеем гаварыць ды дамаўляцца. Мы маем права на годнае жыццё. І няхай ідэя нацыянальнага адраджэння дапаможа нам у гэтым.

Кансультатыўная Рада дэмакратычных партый ды рухаў места Віцебска.

Адкрыліся вочы, пасвятлела ў галаве

По ініцыятыве раённай суполкі БНФ адбылася сустрэча Народных дэпутатаў Рэспублікі з жыхарамі Докшыц.

У сустрэчы ўдзельнічалі З. Пазьняк, С. Панкоў, У. Новікаў, а таксама намеснік старшыні Сойма БНФ Ю. Хадыка і сакратар В. Івашкевіч.

Народны дэпутат С. Панкоў ахарактарызаваў сучаснае становішча ў Рэспубліцы, расказаў аб прычынах негатыўных з'яваў у жыцці Беларусі, падкрэсліў сувязь кіраўнікоў улады розных узроўняў паміж сабою і падтрымку імі адзін аднаго. Дайшло да таго, што дэпутаты, злоўленыя за руку за крадзеж ці махінацыю, не могуць прыцягнуцца да адказнасці, бо мясцовыя Саветы не даюць на гэта згоды. А дзейнічаюць яны так таму, што ўсюды, аж да самага верху, адчуваюць падтрымку. Таму і скаргі выбаршчыкаў, накіраваныя ў любыя інстанцыі, застаюцца без рэагавання. І толькі аднаго баяцца сучасныя кіраўнікі—рэферэндума. Яны ведаюць, што рэферэндум паложыць канец іхняму кіраванню.

Народны дэпутат З. Пазьняк ахарактарызаваў палітычнае становішча ў Вярхоўным Савеце, дзе перавагу ўзяла партыйна-наменклатурная большасць. Працаваць яна не здольна, затое блакіруе ўсе сур'ёзныя прапановы і па-гэтаму топчацца на мейсцы.

Падрабязна гаварыў З. Пазьняк і аб эканамічнай дзейнасці нашага ўраду, як цягнецца ў абозе за Расеяй, таму заўсёды спазняецца з прыняццем жыццёва важных рашэнняў. Затое ён стараецца запэўніць нас, што толькі з Расеяй мы зможам выжыць, а без яе прападзем, бо мы такія бедныя. Але ж, сказаў З. Пазьняк, ёсць доказы вучоных, што Беларусь мае дастаткова і прыродных выкапняў, і матэрыяльных рэсурсаў, каб існаваць самастойна. Шмат гаварыў З. Пазьняк і аб неабходнасці культурнага адраджэння беларусаў як нацыі. Без гэтага мы не зможам рухацца далей і будзем заставацца ў залежнасці ад Расеі і іншых краін.

Прафесар Ю. Хадыка расказаў аб сапраўдных мэтах і задачах Беларускага народнага фронту і аб тым брудзе, які вылівала і вылівае на БНФ камуністычная прэса.

Народны дэпутат Рэспублікі ад Докшыцкага раёна І. М. Новікаў выказаў свае адмоўныя адносіны да рэферэндуму і расказаў аб поспехах кіруемага ім калгаса «Зара камунізму».

На сустрэчы выступілі і жыхары Докшыц. Яны гаварылі аб мясцовых праблемах, аб сваіх асабістых бедах.

Тры гадзіны працягвалася сустрэча, і ўвесь час не аслаблялася ўвага прысутных, а іх было больш за трыста.

Выходзячы з залы, прысутныя казалі: «Добра, што прыехалі такія дэпутаты. Яны адкрылі нам вочы на многае. Ды й у галаве пасвятлела. Больш бы такіх сустрэч.»

І. ФУРСЕВІЧ.

Докшыцы.

На заметку избирателям

ДАЖЕ НЕ ПОЖУРИЛИ ТИХОНА ИВАНОВИЧА

На днях заместитель председателя областного Совета народных депутатов Тихон Иванович Мисуно как будто бы держал ответ перед членами двух комиссий облсовета (по демократизации, гласности и правопорядку и мандатной) за тот рождественский подарок стоимостью 16822 рубля, который он преподнёс своему сыну накануне 1992 года: новенький трактор «МТЗ-80».

Т. Мисуно убеждал собравшихся, что вся его сознательная жизнь отдана партии и народу, что он тоже живой человек и ничто человеческое ему не чуждо. Сын имеет земельный надел 0,15 га.

Потом стали один за одним выступать члены комиссий. Народные избранники пытались почему-то отыскать «смягчающие» обстоятельства, дабы оправдать Мисуно.

В конце концов кто-то предложил создать льготный список лиц для приобретения дефицитных товаров и вносить в этот список, разумеется, не измученных очередями женщин, пенсионеров и других рядовых граждан, а... начальников различных рангов в случае перевода их на другую работу или ухода на пенсию. Очевидно, в благодарность за то коммунистическое изобилие, которое они создавали за годы советской власти.

Данное обсуждение не удовлетворило народного депутата Ю. Лавренова. Он предложил передать материалы, связанные с действиями Т. Мисуно, на рассмотрение очередной сессии областного совета.

Тихон Иванович тут же заметил, что это повторение 1937 года, когда батька нёс ответственность за сына, а сын за отца.

Иронических улыбок у членов комиссий по поводу этого высказывания не последовало. Остались невозмутимыми их лица и после того, как заместитель председателя областного Совета высказал свои подозрения по поводу соучастия председателя комиссии по развитию науки, народного образования и культуры областного совета народных депутатов директора СШ № 40 Ю. Лавренова в преступной «группе»...

Предложение Юрия Александровича не прошло. Никто из членов комиссий не поднял за него руки. Решили ограничиться обсуждением вопроса о подаренном тракторе на заседании президиума областного Совета.

Б. ХУДЯКОВ.

P. S. **Состоялась встреча представителей демократических партий и движений города Витебска с начальником УВД облисполкома А. Клещёнком.**

Алексей Филиппович пояснил, что никакой информацией о каких-то связях Ю. Лавренова с преступными группами управление внутренних дел облисполкома не располагает.

Алесь МАЗУР

Парадоксы жыцця

Як усё ў жыцці нетрывала,
Нібы той павуцінкі ніць.
І спагаднасці, шчырасці мала,
Што душа ад зняверу баліць.
І вось я не такі ўжо храбры,
Асцярожны, нібы ў ледастаў...
Хто быў ворагам—стаў маім сябрам,
Хто быў сябрам—той ворагам стаў...

І мне горка, і мне балюча
Ад такіх парадоксаў жыцця.
Толькі вось не прымаю рашуча
Ні маны, ні зграызот, ні ныцця...

Нібы Богам наканавана
Распазнаць, дзе натура, дзе грым,
Ратаваць душу ад заганаў,
Каб трывалае штосьці стварыць.

Свая вайсковая гісторыя

У нас свая вайсковая гісторыя. Чужынцы ж вынішчалі памяць пра нашу славу. І ўхвалялі, шанавалі забойцаў беларусаў і іхняе волі. І ў чарговую 582 гадавіну найважнейшае старажытнае падзеі для славянства і балтаў—Грундвальскае бітвы—Віцебская рада БНФ зладзіла акцыю інфармацыйнага пратэсту супраць сучаснае назвы вуліцы Суворава. Прозвішча крывавага душыцеля незалежніцкага паўстання беларусаў не мусіць быць услаўлена на нашай зямлі—такая ідэя гэтага выступлення.

Ю. СЦЯПАНАЎ.

Хто баіцца рэферэндуму?

На старонках газет, асабліва раённых, дасюль ідуць гарачыя спрэчкі: «Быць ці не быць рэферэндуму?» Большая частка выступленняў—супраць яго. Аргументы вядомыя: «коней на пераправе не мяняюць», «няма каго выбіраць». «Да ўлады дарвуцца дэмакраты, а камуністаў і працоўных не дапусцяць» і г. д. Пагадзіцца з тым, што гэта сапраўды—«голас народа» было б памылковым, бо пішуць аб гэтым у асноўным пенсіянеры.

Але справа нават не ў гэтым, здзіўляе другое. Тыя, хто ставяць пытанне—«быць ці не быць», пэўна не чыталі Закона аб рэферэндуме. А ў ім жа сказана: калі ініцыятыўная група выканала патрабаванні Закона, гэта значыць сабрала 350000 подпісаў, рэферэндум павінен праводзіцца. У даным выпадку сабрана больш за 400000 подпісаў аб неабходнасці правядзення рэферэндуму. Прычым умовы былі суровыя: і пашпарт патрабавалі, і прапіску, і подпіс старшыні выканкама павінен быць асабістым, а не шматлікім факсіміле, якім калісьці зацвярджалі Ганаровыя граматы даволі высокіх «камаў», ды і дасюль зацвярджаюць розныя выканкамаўскія дакументы. Патрабаванні Закона выкананы. Значыць і Закон павінен выконвацца. Бо як жа Вярхоўнаму Савету не выканаць Закон, які ён сам прыняў год назад? Што скажуць тыя 400000 (ды й не толькі яны), што падпісалі гэтае патрабаванне? Ды й міжнародную грамадскую думку сёння трэба ўлічваць.

Але чаму гэта так шмат людзей выступае супраць рэферэндуму, у тым ліку і ў Вярхоўным Савеце? Няўжо ўсе яны робяць гэта толькі з-за любові да народа? Але ж мы добра ведаем, як праходзілі выбары ў Вярхоўны Савет і хто туды трапіў. Бачылі, і не раз, як працуе Вярхоўны Савет. Хто и сапраўды працуе, хто чытае газету, хто драмае, каго й зусім не бывае. Ведаем, якія мяккія крэслы ў намесніка Старшыні Вярхоўнага Савета, які там буфет. А калі дадуць сюды яшчэ добрую другую зарплату і шмат розных прывілеяў, то можна зразумець, што толькі дзівак добраахвотна адмовіцца ад усяго гэтага, добра ведаючы, што ў наступны раз туды не трапіш.

Супраць рэферэндуму і дэпутаты ніжэйшых рангаў. Яны бяруць прыклад са сваіх «вышэйшых» калегаў. А паводзяць сябе шчэ горш. Ну сапраўды, дзе, у якой краіне ва ўстановах улады працуюць людзі, якіх трэба судзіць? А ў нашых Саветах такія ёсць, запытайце пра гэта Генеральнага пракурора. І судзіць іх ніяк не могуць, бо сябры іх у Саветах не даюць на гэта згоды. Такога нават пры камуністычнай уладзе не было. Тады несумленнага чалавека, хоць на пэўны час, а знімалі з пасады. А цяпер—нічога. Кіруе, дык як жа можна дабраахвотна адмовіцца ад «карыта»? Не зацікаўлены ў рэферэндуме і розныя дзялкі ад «ценевай эканомікі», сярод якіх нямала былых партакратаў! Цяпер ім самая спрыяльная пара для лоўлі рыбы ў каламутнай вадзе.

Хорам выступаюць супраць рэферэндуму і «простые труженики»—пенсіянеры. Адны з іх спадзяюцца, што сучасным дэпутатам у Вярхоўным Савеце з аб'яднання «Беларусь» удасца павярнуць кола гісторыі назад, другія проста не могуць успрымаць усё новае, што адбываецца цяпер, і іх палохае невядомая будучыня.

Шмат хто сцвярджае, што няма, маўляў, у нас і людзей, з каго можна б выбраць новы Вярхоўны Савет. Але ж сапраўды мы так збяднелыя разумам, што ва ўсёй Рэспубліцы не знойдзем сотню людзей для працы ў парламенце? І ў сучасным Вярхоўным Савеце ёсць людзі, якія і могуць, і працуюць сумленна. І сярод народа знойдуцца такія, і сярод камуністаў, і сярод дэмакратаў, і сярод беспартыйных. Бо членства ў той ці іншай партыі тут ролі не адыгрывае. Гэта толькі раней лічылася, што, калі ты камуніст, то «и ум, и честь, и совесть», хаця ўсе мы ведалі, што гэта не так. І сапраўды, хто возьмецца параўноўваць гэта наогул. Напрыклад, заслугі перад літаратурай і народам былога камуніста Ніла Гілевіча і беспартыйнага Васіля Быкава. А сярод сучаснай апазіцыі ў парламенце і наогул не можа быць людзей несумленных. Усе яны ходзяць пад пастаяннымі «праменямі» былых партакратаў і кожны іх крок кантралюецца. Іншая спраа, што ў парламенце непатрэбны ні даяркі—пеяркі, ні трактарысты-машыністы, ні ўрачы і інжынеры, ні «ганаровыя генералы». Усе яны ўжо былі і іх кіраванне мы добра ведаем. Нам у парламенце патрэбны спецыялісты. І такія знойдуцца.

Таму і не трэба нас палохаць рэферэндумам. І рэферэндум патрэбен, і змены ў Вярхоўным Савеце (ды і ў «ніжэйшых» Саветах) неабходны. Без іх мы будзем таптацца на месцы, а магчыма і спаўзаць у балота.

І. ФУРСЕВІЧ.

Докшыцы.

Выстава «Кругаварот»

У Віцебскім абласным навукова-метадычным цэнтры адкрылася выстава «Кругазварот», прымеркаваная да 110-й гадавіны народзінаў песняроў беларускіх Я. Купалы й Я. Коласа. Экспазіцыя, складзеная з прац народных умельцаў, прадстаўляе гадавы абег, кола жыцця беларуса ў асноўных абрадавых святах і штодзённай сялянскай рабоце.

Ю. СЦЯПАНАЎ.



Письма наших читателей

Защитим от необольшевизма наше будущее!

Взяться за перо меня вынудило то обстоятельство, что в подшивках витебской периодики, просмотренных мною, я не нашел ни слова о самой обездоленной категории людей —жертвах политрепрессий. И поэтому решил обратиться в газету.

Нас—оставшихся в живых и доживших до сегодняшнего дня—доля процента. А если быть более точным—тысячная доля процента по отношению к населению городов, таких как Витебск, Гомель, Минск...

В Минске, Гомеле, Бобруйске, Бресте созданы и функционируют ассоциации жертв политических репрессий. Они объединились в Белорусскую ассоциацию и избрали своих Президента и Вице-Президента. Ими стали профессор Георгий Васильевич Штыхов, работающий в Белорусской АН и Владимир Иванович Адамушко—молодой энергичный кандидат наук, работник архивного управления при Белорусской академии. В Витебске такой ассоциации нет. Своим опытом Гомельская ассоциация щедро поделится, окажет нужную помощь, но начните и вы святое дело, люди добрые, витебляне.

Зарегистрировавшись и получив статус юридического лица, открыв счет в банке, мы обратились к ряду малых предприятий и предпринимателей города и области, и они оказали нам денежную помощь.

Выделили средства и исполкомы областного и городского советов и перечислили их на наш банковский счет. Для проведения наших собраний Советский райисполком предоставляет нам свой конференц-зал, оказывает помощь и содействие. А сессия горсовета приняла решение, по которому приравняла нас по льготам к категории инвалидов войны. Из наших денежных средств мы оказываем помощь членам ассоциации. Нам оказывается гуманитарная помощь.

Но мы не только просители и иждевенцы. Проводим большую работу по защите прав реабилитированных, оказываем конкретную помощь, когда нарушается законодательство, ущемляются права людей. Например, некоторые ретивые председатели колхозов не желают вернуть изъятое при репрессиях в натуре, а предлагают заменить это, с позволения сказать «компенсацией» в три—пять тысяч рублей. Что они стоят сейчас, эти пять тысяч?

Обязательно хочу дать разъяснение о компенсации в 160 рублей за каждый месяц отсидки.

Мы от этой подачки отказались и поставили этот вопрос перед уважаемыми С. С. Шушкевичем и В. Ф. Кебичем, перед Президентом и парламентом России на международной конференции «Сопротивление в ГУЛАГе» в Москве. Белорусский Верховный Совет пообещал рассмотреть этот вопрос на сессии и применить индексацию к тем 160 рублям относительно сегодняшнего курса рубля. Нам обещают. А вот дачу Дементею, которую сожгли умышленно, как утверждают «правоохранительные органы», приняли решение построить заново за наш с вами, уважаемые граждане Республики Беларусь, счет. Это же самый «бедный» человек нашей республики, как Рыжков в России. Впрочем, заметьте: оба Николая Ивановича в таком почете не за дела свои, а за должности. А дела их нам известны: ничего эти государственные мужи не сделали, чтобы спасти

(Окончание на 6-й стр.).

Каму выгадна абвастрэнне?

Мінулым летам прыхільнікі «сацыялістычнага выбару» і адзінага Саюза запалохвалі народ голадам. Ім гэта было неабходна, каб апраўдаць увядзенне надзвычайнага становішча. Завяршэннем іх намаганняў быў няўдалы путч.

Голад не наступіў: далі зямлю. Праўда, далі няшмат і не ўсім жадаючым. Але нават гэтага было дастаткова, каб толькі на Віцебшчыне статак буйной рагатай жывёлы на асабістых падворках павялічыўся больш як на 10 тысяч.

Сёння голад, відаць, можа наступіць толькі тады, калі адбяруць усё, што далі, а калгаснікаў прыб'юць, як некалі Хрыста на крыж, цвікамі да калгасаў, што развальваюцца на вачах.

Але тыя, хто імкнецца павярнуць усё зноў назад, шукаюць іншыя аргументы. Зараз імі сталі беспрацоўе, якое насоўваецца як снежны ком, ды падзенне жыццёвага ўзроўню асноўнай часткі насельніцтва.

Адсутнасць у кіруючых колаў цэльнай канцэпцыі да пераходу к рынку, супярэчлівасць рыначным адносінам прымаемых Вярхоўным Саветам Беларусі законаў, незацікаўленнасць мясцовых органаў кіравання ў правядзенні рэформаў прывялі да тупіка як у сельскай гаспадарцы, так і ў прамысловасці.

А тут яшчэ штучнае, па загаду зверху, павышэнне цэнаў пры пануючым дзяржаўным сектары ў эканоміцы і адсутнасці законаў рынкавага характару яшчэ больш абвастрыла становішча.

Зніжэнне жыццёвага ўзроўню пры манапольнасці вытворчасці зрабіла незапатрабаванай рынкам нават неабходную грамадству прадукцыю.

У выніку ўсяго гэтага непазбежна зніжаюцца аб'ёмы вытворчасці, узнікае пагроза беспрацоўя.

Змарнаваных у пошуках працы людзей лёгка спакусіць на патрабаванне да вяртання ў мінулае, да аднаўлення Саюза, да ўвядзення «моцнай рукі». Ну, а хто лепш, як не партыя камуністаў, маючая ў гэтым вопыт, можа выканаць ролю гэтай рукі? Становіцца адразу бачным, каму выгадна абвастрэнне становішча, хто марудзіць і не прымае рынкавыя законы ў Вярхоўным Савеце, а калі і прымае, як гэта здарылася з законам аб прыватызацыі жылля, дык не на карысць большасці насельніцтва.

Кіраўніцтва Беларусі не імкнецца да ўсталявання сваёй дзяржаўнасці. Большасць з яго толькі робіць выгляд, што клапоціцца аб гэтым. А некаторыя адкрыта кажуць, што прызнаць дзяржаўнасць Беларусі вымусілі Вярхоўны Савет абставіны. Большасць яго складу сёння, калі зменяцца варункі, гатовы аднаўляць Саюз, адбудоўваць ваенна-прамысловы комплекс.

Толькі ці рэальна гэта?

Адну Малдову ў СНД зацягнуць па-сапраўднаму чаго варта! А каб аднавіць старую сістэму, каб яна працавала, як раней, неабходна будзе вярнуць Закаўказзе, Прыбалтыку, Украіну, усталяваць сацыялістычны лад ва Усходняй Еўропе, нават прыдзецца адарваць кавалак у Германіі.

Відаць, лепей і надзейней упарадкаваць свой дом—Беларусь. На сёння такія ўмовы існуюць. Больш як 440 тысяч жыхароў Беларусі патрабуюць правядзення рэферэндуму аб недаверы Вярхоўнаму Савету. Гэтыя патрабаванні прызнаны законнымі, і ён будзе праведзены.

Пры станоўчых выніках рэферэндуму паследуюць новыя выбары Вярхоўнага Савета на аснове новага, больш дэмакратычнага закона аб выбарах.

Ёсць магчымасць гэты непрацаздольны Савет замяніць на такі, які зможа стварыць Урад Народнага Даверу, дазволіць замяніць мясцовыя ўлады, абраць незалежныя, а не вызначаныя некалі партыйнымі органамі, суды. І ўсё гэта цывілізаваным шляхам і ў бліжэйшы тэрмін.

А пакуль гэта ж не зроблена, пакуль адсутнічае канцэпцыя пераходу да рынку, адсутнічаюць законы, напаўняючыя гэтую канцэпцыю, адсутнічае ўлада, здольная гэта рэалізаваць, каб пазбегнуць масавага беспрацоўя, абвастрэння становішча, няма іншага выйсця, як патрабаваць ад Урада Рэспублікі, адміністрацыі дзяржаўных прадпрыемстваў і устаноў не праводзіць звальненні, выкліканыя скарачэннем вытворчасці.

У. ПЛЕШЧАНКА.

Дзве публікацыі на адну тэму

СХОД РАБОЧЫХ, ЦІ ПЛЕНУМ ГАРКАМА ПКБ?

Кіраўнікі зноў утвораных і аднаўленых арганізацый пракамуністычнага накірунку ДСПС, ПКБ і іх папярэднікі, якія на Беларусі на сёння ў падаўляючай большасці ва ўладзе, добра разумеюць, што рэферэндум непазбежны, а за ім новыя выбары. Але ж адкрыта з камуністычнымі ідэямі ды такімі назвамі палітычных арганізацый да народа не пойдзеш і выбары не выйграеш.

Таму яны і пачынаюць ствараць падпарадкаваныя ім, але ад імя рабочых, ад імя прафсаюзаў арганізацыі. Рыхтуюць ад іх звароты да грамадзян, патрабаванні да ўладаў, робіцца імітацыя, нібыта ўсё гэта ідзе ад шырокага кола грамадзян. Яны, канстатуючы нязгоду ў грамадстве і надыходзячы крах у эканоміцы, які стварылі не хто іншыя, як іх паплечнікі былыя камуністы, бо ўлада сёння ў іх, не прапаноўваюць нічога канструктыўнага дзеля паляпшэння становішча, акрамя вяртання ў недалёкае мінулае, аднаўлення каманднa-адміністратыўнай сістэмы і ваенна-прамысловага комплексу.

Прыкладам хлусні і дэзынфармацыі, спробай выкарыстаць імя рабочых, было правядзенне 30 чэрвеня, як напярэдадні аб'яўлена, канферэнцыі рабочых прадстаўнікоў працоўных калектываў і прафсаюзных арганізацый, якая пад націскам склаўшыхся абставін была па ходу перайменавана ў сход, бо на канферэнцыю прадстаўнікі павінны абірацца ў калектывах, а гэтага, вядома, арганізатары рабіць і не збіраліся.

Падрыхтоўку канферэнцыі, спіс выступаючых, патрабаванні ажыццявіў не «міфічны» аргкамітэт рабочых, а нядаўна створаны гаркам ПКБ з дапамогай некаторых кіраўнікоў прафсаюзаў, такіх, як Зоя Крот ды старшыня прафкама завода «Мегом» Юры Піскуноў.

Прэзідыум, рэдакцыйная камісія, амаль усе выступаючыя былі ад іх. Не прадугледжанай арганізатарамі думкі не кажучы ўжо пра іншадумства, там месца не было. Слова не давалі. Патрабавалася не думка рабочых, не яны самі, а іх імя. І кантынгент быў падабраны ў асноўным ветэранскі. І ахова была (аж два нарады АМАП!), як некалі пры правядзенні партыйных форумаў. І гарадскія з абласнымі ўлады прысутнічалі. А вось рабочых амаль не было.

Аб чым жа казалі выступаючыя, вядома, каму гэта было дазволена?

Ні аб дзікай прыватызацыі, якую праводзяць улады ў адсутнасці законаў, ні аб няўхісна набліжаючымся скарачэнні рабочых месц у вытворчасці, дзе ў першую чаргу павінен скарачацца адміністратыўна-кіраўнічы апарат, а не тыя, хто вырабляе прадукцыю, гаворка не йшла.

У асноўным выказваліся аб жыда-масонскім загавары, аб змове з ЦРУ дэмакратаў па разбурэнню СССР, аб неўспрыманні дзяржаўнасці Беларусі, яе сімволікі, аб адмове аб беларусізацыі грамадскага жыцця. Увогуле большасць выступленняў нагадвала прамовы на мітынгу пры асадзе чырвона-карычневымі «Астанкіна» ў Маскве. Ды і не дзіўна—выступалі ж удзельнікі таго штурму і асады. Няўжо 75 гадоў ім было мала, а нас гэты тэрмін нічаму не навучыў?

П. УЛАДЗІМІРАЎ.

Давайце разбяромся

КАКАЯ ПЕРЕПРАВА—ТАКИЕ И КОНИ

Совсем недавно разговаривал с одним люмпеном—рабочим.

—Скоро народ возьмется за вилы, достанется партократам и демократам,—воинственно произнес он.

—Ну, первым, очевидно, за 74 года «светлого будущего», а вторым за что?—спросил я.

—Захватили власть и развалили страну,—последовал ответ. Причем, сей оракул вещал от имени всего гегемона.

Хорошо, что не вешать собираются, хотя и в обещанном мало приятного. Есть над чем подумать.

Можно было бы не обращать внимания на бредовые кликушества моего оппонента, если бы не катастрофическое положение в промышленности.

Разрыв хозяйственных связей, отсутствие материалов и комплектующих изделий, дефицит наличных денег для выплаты зарплаты, переход на неполную рабочую неделю—вот далеко неполный перечень возникших проблем.

Не случайно на проходившей недавно встрече руководители промышленных предприятий подготовили и направили свои предложения правительству и потребовали принятия экстренных мер.

Как видим, обстановка накаляется, пружина сжимается до предела.

И надо же, как раз в это время находятся охотники поиграть на нервах рабочих. «Радетели» пролетариата начинают громче всех голосить. Дескать, демократы довели народ до ручки.

Ну что ж, давайте разберемся.

После августовского путча часть партийного аппарата, те кто пошустрей и у кого была голова на плечах не для того, чтобы пыжиковую шапку носить, подались в бизнес. Не обошлось без лакомого кусочка партийной собственности.

Ребята, этих уже бывших членов КПСС никаким калачом в «развитой социализм» не заманишь. Да и интересы бывшей правящей, как говорится, им теперь до лампочки. Появилась собственная мечта жить красиво, иметь свое дело. И в этом, разумеется, ничего нет плохого.

Другая же часть партократов и им подобных не получила своей доли от партийного пирога, оказалась обделенной, а значит и обиделась. Эти люди стояли подальше от номенклатурного корыта. Вот им и хочется сейчас вернуться на круги своя, а чего доброго—выбиться в первые роли.

Так что же? Вырвем зубами свое (как им кажется)? Подойдем поближе к столу и получим доступ к незаработанному пирогу? А для этого нужна реальная власть. О ней и мечтает кое-кто из тех, у которых имеются дипломы об окончании ВПШ, В этом учебном заведении, как и в той же Академии общественных наук при ЦК КПСС знакомили с широким арсеналом партийного строительства. Это ничего, что не получился главный фокус КПСС: построение социализма с человеческим лицом (оказывается социализм многолик) в одной отдельно взятой стране.

В запасниках сегодня имеются и другие фокусы. Можно сказать целый набор всевозможных хитростей и уловок.

Фокус первый: Все основные претенденты на власть пока находятся в тени. И не случайно. Люди помнят, кто и на какой ступени номенклатурной лестницы стоял. Убедить народ в разительном перевоплощении зубастого волка в добрую бабушку—пустая затея. А притупить бдительность избирателей, то бишь нас с вами, крайне необходимо. Поэтому любители загребать жар чужими руками и здесь находят выход.

На политическую авансцену выталкивается пестрая марионеточная публика. Кого тут только нет!

Это элитные рабочие, которые ранее кимарили в президиумах съездов, пленумов, партактивов в качестве свадебных генералов. Это им в партийных кабинетах помогали выполнять пятилетку за два года, писали речи, вешали на грудь орден или медаль.

Это и небольшая часть ветеранов из бывшей номенклатурной обоймы, получающая подачки от прокоммунистических мифических организаций.

Это все те, кто горит желанием не создавать материальные ценности, а их распределять.

Это, наконец, и те, кто с пионерского возраста одурманен тоталитарной пропагандой и искренне заблуждается, верит в социализм.

Все эти борцы за наше славное прошлое активно выступают на митингах, собраниях, слетах, зачастую не догадываясь какую роль им отводят реальные организаторы этих акций. «Режиссеры» как правило не высовываются, располагаются в гуще зевак, подальше от объективов фото- и телекамер. Они внимательно следят за последовательностью совершаемых действий в разыгрываемом ими «спектакле».

Таким образом делается попытка создать видимость рабочего движения. Цель очевидна: проникнуть в рабочую среду и оседлать эту реальную, но пока социально пассивную силу. Ведь КПСС всегда считала себя партией рабочего класса.

Однако манипуляция марионеточной публикой сегодня очевидна. И тут приходится пускать в ход **фокус второй:** демократы у власти—и результат на лицо. Раз есть власть, значит должна быть оппозиция. А кто в оппозиции у демократов? Те же партаппаратчики, различные организации прокоммунистического толка. А раз власть, дескать, своими действиями себя дискредитировала, то значит отдавайте свои голоса, товарищи избиратели, на будущих выборах, за оппозицию. Ловкий маневр?

Добрые, милые избиратели! Каковы же факты? В республике нет ни одного Совета, где бы большинство было у демократов. В нашем городском и областном Советах демократов можно пересчитать по пальцам одной руки. Настолько там рябит в глазах от красного цвета. Только в Верховном Совете республики около 10 процентов принадлежит нынешней оппозиции. Основная масса депутатов—партийная номенклатура. На выборах шла от одной правящей партии. В партийных комитетах сквозь лупу рассматривали объективки кандидатов. Проверялись на протяжении многих лет делом. Этим и только этим можно объяснить торпедирование многих прогрессивных законов в Верховном Совете.

Вот Вам и власть у демократов! И вот здесь в самый раз показывать **фокус третий:** нас начинают вполне серьезно убеждать в том, что номенклатурные депутаты—это лжекоммунисты, предали социализм и коммунистическую идею, не оправдали доверие избирателей. Более того, внушается мысль, что безвольное большинство идет на поводу у депутатской группы БНФ. Этим фактором пытаются объяснить принятие законов о белорусском языке, национальной символике, ратификацию Беловежского соглашения трех славянских государств и т. д.

Оказывается, для политических целей все средства хороши. Можно даже и на своих коллег—единомышленников по КПСС навести тень на плетень.

Если нынешние народные депутаты, из бывшей партийной обоймы тоже плохие, то кто же допустил такой серьезный промах? Какая партия все годы занималась подбором, расстановкой и воспитанием кадров? Неуже-

(Окончание на 7-й стр.).




30 июня 1992 г. ДК и Т профсоюзов.

Сценарий сходки нарушен: выступает демократ В. Плещенко.

Нам пішуць з замежжа

Нарыс аб беларусах у Аўстраліі



Алесь Алехнік у 1970 годзе.

АЛЕСЬ ПАД

Як безпасрэдны рэзультат цяжкага варожага паняволяньня і трагічных падзей на Беларусі падчас 2-ай Сусьветнай вайны, па заканчэньню канфлікту ў Эўропе ў 1945-м годзе ў Заходняй частцы Эўропы апынулася вялікая і Нацыянальна-сьведамая Беларуская эміграцыя, якая, нягледзячы на несприяльныя ўсё яшчэ для беларусаў палітычныя абставіны, пачала адразу гуртавацца ў сваіх беларускіх асяродках. І былі вялікія надзеі што гэтая, у параўнаньні з папярэднімі эміграцыямі найбольшая і найлепей арганізаваная, будзе сапраўды вялікай сілай у змаганьні за вызваленне свайго паняволянага народу...

Апынуўшыя на чужыне, беларусы адразу і з вялікім болем адчулі катастрафальную адсутнасьць сапраўднай веды пра Беларусь і пабачылі, што нават у блізкіх па адлегласьці краінах Заходняй Эўропы пра Беларусь амаль-што нічога сапраўднага ня зналі ды, пад уплывам варожай прапаганды, часта нават не хацелі беларусаў знаць і прызнаваць іх за асобную нацыю... У 1956-м годзе адбыўся адзін эпізод, які ярка даказвае тыя труднасьці, якія напаткалі беларусаў на эміграцыі. Здарылася наступнае.

У лягэр, які знаходзіўся ў 100 км ад г. Мюнхэна ў Баварыі, дзе жылі прыблізна 1000 беларусаў (пераважна палешукоў), з невялічкай дабаўкай украінцаў ды палякаў, прыехаў адзін паляк (магчыма амэрыканец польскага паходжаньня) і публічна заявіў: «Няма жодных беларусаў, ані жодных украінцаў, ёсьць толькі палякі і расейцы, і такімі трэба запісвацца падчас надыходзячай рэгістрацыі». Паўстала даволі вялікая паніка сярод людзей: што і як рабіць? Каб не дазволіць ворагам канчаткова здэмаралізаваць беларусаў, Грыгор Алехнік з сваім малодшым братам, Алесям, першымі пайшлі на перапіску-рэгістрацыю і на запытаньне—«Якая нацыянальнасьць?» напісалі «Беларусы!». А на пытанне: «Чаму ня хочаце ехаць дамоў у Савецкі Саюз?»—адказалі: «Тагды паедзем на Беларусь, калі яна будзе вольная!».

За Алехнікамі пайшлі ўсе другія жыхары лягэра. Аднак помста палякаў за такую **адвагу** палешукоў была натыхмястовая і лютая!!! Нічога нікому не сказаўшы і зфальшаваўшы дакументы ў галоўным бюро перапіскі, усю сям'ю Алехнікаў і некалькі другіх (тых, каторыя першымі пайшлі за імі ды таксама запісаліся беларусамі) выкінулі з лягэра пад апекай Арганізацыі Аб'едных Нацыяў і закінулі іх у лягэр нямецкіх уцекачоў. Пасьля ўдалося выкрыць зробленую фальшывасьць. І Алехнікам, і ўсім іхнім ...аб рам назад далі дазвол жыць у лягэрах перамешчаных вайной асобаў пад апекай ААН.

Пасьля гэтага адбыўся канчатковы падзел людзей па нацыянальнасьці і ўсе тыя беларусы-палешукі, каторыя былі сьведкамі гэтага нахабнага намаганьня некаторых з нашых суседзяў забараніць беларусам права быць Беларусамі, нават у г. званым вольным Сьвеце, пераехалі жыць у Беларускія лягэры, дзе вельмі шырака разбудоўваліся школы, беларускія тэатры, арганізацыі моладзі і дзе над імі горда развіваўся ў паветры Бел-Чырвона-Белы сьцяг...

Тагды, і нават у цяперашнія часы, людзі часта пыталіся і пытаюць: «Чаму нас, беларусаў, так мала знаюць і чаму пра нас так мала пішуць?»

Галоўныя прычыны гэтаму ёсьць наступныя:

Доўгавяковае паняволяньне Беларусі: Пасьля таго, як Масква канчаткова акупавала Беларусь у 1795-м годзе, і асабліва пасьля таго, як выдалі **Асобны Дэкрэт** у 1840-м годзе, забараняючы нават успамінаць ды ўжываць слова «Беларусь» і пераіменавалі Беларусь як частку «Северо-Западного Края», ніхто у сьвеце нічога сапраўднага пра Беларусь ня чуў. А калі і чуў, дык толькі з вуснаў ворагаў, што «Белая Русь» ёсьць толькі адміністратыўнай часткай Расеі і г. д. Поўная адсутнасьць якой-колечы супрацьдзейнасьці з боку паняволянага беларускага народу дазволіла гэтай маскоўскай прапагандзе **глыбока ўкараніцца** па сьвеце і, як рэзультат, у сьведамасьці палітычна-ўрадавых дзеячоў розных краін сьвету Беларусь, як асобная нацыя, перастала існаваць...

Вялікай перашкодай да правідловага разуменьня Беларусі на Захадзе быў, таксама падыраны Масквой, пераклад слова «Беларусь» на чужаземскія мовы як «Увайт Рашша», або як «Белая Расея», замест правідловага і старажытнага перакладу як «Увайтрутэнія», або на латынскай мове «Альбарутэнія». Гэты фальш, што тычыцца самога назову на чужаземскіх мовах, быў яшчэ болей скамплікаваны ў разуменьні чужынцаў, калі падчас Расейскай грамадзянскай вайны былі «чырвоныя» і «белыя» расейцы і ў разуменьні чужынцаў беларусы былі расейцы—«белагвардзейцы»!!!

Савецкія амбасады—гнёзды расейшчыны... Савецкія Пасольствы, хаця намінальна рэпрэзэнтуючыя ўсе народы, пражываючыя ў Савецкім Саюзе, фактычна і ў сапраўднасьці адыгрывалі ролю традыцыйнага расейскага імперыялізму. Усе працаўнікі Савецкіх амбасадаў у вольным сьвеце намагаліся зрабіць ураженьне, што Савецкі Саюз фактычна ёсьць Расейяй і што ў Савецкім Саюзе жывуць «расейскія людзі». Доказам, як глыбока ўкаранілася варожая прапаганда, што Савецкі Саюз ёсьць «Рашша», можа нават служыць і той эпізод, які здарыўся ў Аўстраліі ў верасьні 1989 г., калі на ТБ—станцыі № 9, падчас адной папулярнай праграмы было пытаньне: «У якой краіне знаходзіцца вялікі горад—Мінск? Адказ быў даны: у Расеі. Гэты адказ быў **адобраны** судзьдзёй праграмы, абавязкам якога было запэўніць, каб адказы былі правідловыя... Галоўны Сакратар Беларускага Аб'еднаньня Аўстраліі зрабіў пратэст, ветліва інфармуючы, што Мінск ёсьць сталіцай Беларусі, якая ўваходзіць у склад Аб'едных Нацыяў як незалежная краіна. У адказе Сп. А. Алехніку «судзьдзя» праграмы стараўся даказаць, што ўжо ёсьць агульнапрыйнятым называць Савецкі Саюз Расеяй. Сп. Алесь Алехнік яму напісаў наступнае: «Згодна Вашага разуменьня, жыдоў можна было называць «нямецкімі нацыстамі» толькі таму, што яны жылі пад нямецкай няволяй».

Бяздзейнасьць Місыі БССР пры ААН... На вялікі жаль, адзінае на Захадзе, гэтак званае прадстаўніцтва Беларусі пры Арганізацыі Аб'едных Нацыяў у Нью Ёрку, ніколі ня выступіла ў абароне сапраўдных праў Беларускага народу і толькі выконвала функцыі «расейскіх папугаяў» і, як рэзультат такой «дзейнасьці», **аўтарытэт Місыі БССР пры Арганізацыі Аб'едных Нацыяў быў ніжэй НУЛЯ!!!**

Усе выступы гэтых фальш-прадстаўнікоў абмяжоўваліся выключна да паўтараньня таго, што ўжо было сказанае маскоўска-савецкім амбасадарам пры ААН. Гэтыя псэўдо-беларускія дэлегаты ніколі ня выступілі за сапраўдную Незалежнасьць Беларусі, пад шыльдай якой яны сядзелі ў ААН, і ніколі не пратэставалі супрацьмаскоўскай палітыкі русыфікацыі і гэнацыду на Беларусі. Былы Міністр Замежных Спраў Аўстраліі Лорд Кэйсы аднойчы сказаў прадстаўніку Беларускага Аб'еднаньня наступнае: «Галасы Беларусі і Украіны былі падараваныя Сталіну Захадам за змаганьне з нацызмам і фактычна з'яўляюцца дадатковымі галасамі Расеі, і беларускія ды ўкраінскія дэлегаты заўсёды галасуюць так, як ім загадваюць расейцы». Лорд Кэйсы таксама выказаў думку, што ў будучыні магчыма будуць зроблены спробы выкінуць дэлегацыі БССР і УССР з ААН. Аднак ён поўнасьцю пагадзіўся з прадстаўніком Беларускага Аб'еднаньня, што Беларусь, як гістарычны народ, мае права быць Незалежнай і ўваходзіць у Арганізацыю Аб'едных Нацыяў як поўнапраўная сяброўка сусьветнай сямейкі вольных народаў.

Нягледзячы на ўсе напатканыя перашкоды, беларусы на Захадзе адразу прыступілі да працы па ўсьведамленьні сьвету пра Беларусь і былі сапраўды вялікія надзеі, што гэтая нацыянальна-сьведамая эміграцыя зможа развеяць густазасеяную ворагамі прапаганду па сьвеце, што «Беларусі не было, няма і быць ня можа» ды падгатуе глебу да хутчэйшага вызваленьня. Але ж раптоўна і неспадзявана для аўтара гэтага агляду і для бальшыні беларускай эміграцыі на Захадзе, паўстаў:

Раскол Беларускай Эміграцыі. Замест пільна патрэбнай еднасьці для змаганьня за самое жыцьцё Беларусі, раптоўна і неспадзявана пачалося **абліваньне брудам адных беларускіх дзеячоў другімі,** ды пачалі публічна выказвацца закіды, што тыя ці іншыя беларускія грамадскія дзеячы на Беларусі падчас нямецкай акупацыі былі «нямецкімі калябарантамі», нягледзячы на тое, што ўсе беларускія нацыянальныя дзеячы на эміграцыі бралі актыўны ўдзел у працы па аднаўленьні зруйнаванага беларускага нацыянальнага жыцьця падчас нямецкай акупацыі, і ўсім ім, праф. Р. Астроўскаму, гэн. Ф. Кушалю, Сабалеўскаму, Станкевічам, Рагулям, Шчорсам, Кандыбовічам, Віцьбічам, Сяднёвым, Кавылям ды Равенскім і ўсім другім, належыцца ШЧЫРАЕ БЕЛАРУСКАЕ ДЗЯКУЙ!!! На эміграцыі была шырака разпаўсюджана пагаворка, якая кажа, што: «Няма нічога болей вартаснага ў жыцьці як СВАБОДА. І няма нічога болей пачотна-ганаровага як ЗМАГАНЬНЕ ЗА СВАЮ СВАБОДУ». І паняволяная, выбіваная ворагамі ды, фактычна, паміраючая МАЦІ-БЕЛАРУСЬ вымагала і патрабавала ад усіх сваіх дзетак неадкладнай і ахвярнай дзейнасьці па ўзмацненьню нацыянальнай сьведамасьці беларускага народу—ды каб хаця часткова аднавіць праявы беларускага дзяржаўнага жыцьця...

На думку аўтара, заданьнем кожнага беларускага Патрыёта, нягледзячы на мейсца пражываньня, дзяржаўнага прыналежаньня і палітычнага пераканаьня, ёсьць—ВЫКАРЫСТОЎВАЦЬ КОЖНАГА ВОРАГА І ЎСЕ ПАДЗЕІ НА КАРЫСЦЬ ВЫЗВАЛЕНЬНЯ БЕЛАРУСІ!!!

З прабегам часу беларуская эміграцыя канчаткова разбілася на варожыя адзін да другога групоўкі. Адна з палітычных груповак нават **пастанавіла** замяніць назоў Беларусі на «Крывія» і пачала выдаваць свае часапісы пад гэтым, нікому невядомым, нацыянальным назовам. Адным з першых такіх, незразумелых у той час для аўтара артыкулу, часапісаў быў часапіс «Крывічанскіх Скаўтаў» у 1946-м годзе... Аўтар гэтага артыкулу ня быў і ня ёсьць супраць таго, каб Парлямэнт Беларусі дакладна перагледзеў назоў «Беларусь», асабліва міжнародны пераклад гэтага назову. Але як-жа некалькі сотняў людзей, пражываючых па-за межамі краіны, могуць легальна замяніць назоў краіны, над якой яны ня маюць жоднага кантролю??? Ворагі, няма сумніву, моцна цешыліся з гэтых непаладкаў сярод беларускай эміграцыі. Чужынцы пасьмейваліся ды называлі яго доказам «нацыянальнай недасьпеласьці». Сапраўды гэты эпізод у жыцьці беларускай эміграцыі мог бы быць «вялікім жартам», каб ён не прынёс беларускай нацыянальна-вызвольнай справе такой вялікай шкоды.

Нягледзячы на разкол, адказныя асобы сярод Беларускай інтэлігенцыі на эміграцыі пачалі арганізоўваць дзейнасьць з мэтай як найшырэйшага ўсьведамленьня сьвету пра Беларусь і атрыманьня ад краін вольнага сьвету, прынамсі маральнай, дапамогі ў змаганьні за вызваленьне Беларусі. Гэта моцна занепакоіла тых «апанэнтаў» незалежнасьці Беларусі, каторыя таксама пражывалі на Захадзе і каторыя таксама намагаліся загамаваць або спаралізаваць вызвольную дзейнасьць беларускай эміграцыі і, як вынік адбылося:

Падпісаньне Дагавору «Непрадрашэнства». Расейскія «белыя» эмігранцкія арганізацыі былі моцна занепакоянымі нацыянальна-сьведамай эміграцыяй з паняволеных у г. зв. «Савецкім Саюзе» краінаў. Базаваны ў Злучаных Штатах Амэрыкі «Комитет Освобождения Народов России» пачаў шукаць сярод беларускай, украінскай і другіх нацыянальных эмігранцкіх арганізацыяў тых, каторыя згадзіліся-бы (за грошы) адлажыць справу Незалежнасьці сваім краінам на вырашэньне «Усерасейскаму Парлямэнту» ў Маскве пасьля зьнішчэньня камунізму. Гэты, на думку аўтара, вельмі шкодны і варожы для Беларусі, акт знаны пазьней як «Акт Непрадрашэнства», быў **адразу і поўнасьцю адкінуты** Прэзідэнтам Беларускай Цэнтральнай Рады праф. Р. Астроўскім і таксама кіраўніцтвам Арганізацыі Украінскіх Нацыяналістаў. Аднак знайшліся і такія «тоже белорусы» (як іх называлі расейскія арганізацыі), каторыя падпісалі гэты дагавор—за што яны атрымоўвалі амерыканскія даляры (Юдавыя сярэбранікі) і мелі нават нахабства называць свой крок «мудрай палітыкай»... Аўтар гэтага артыкулу ўважаў тагды, і заўсёды будзе ўважаць падпісаньне «Акту Непрадрашэнства» з расейцамі як вельмі шкоднае для беларускай вызвольнай справы—**бо як-жа сапраўдны Беларус-Патрыёт можа прадаць лёс свайго народу на вырашэньне тым, ад каго Беларусь хоча вызваліцца!!!**



Паход беларускай групы падчас антыкамуністычнай міжнароднай дэманстрацыі ў 1967 годзе

У 1949—1950-х гадах пачаўся пераезд беларускай эміграцыі ў Заходняй Эўропе ў розныя заморскія краіны, пераважна ў Злучаныя Штаты Амэрыкі, Канаду, Англію ды Аўстралію на сталае жыцьцё. Так беларускія «перамешчаныя вайной асобы» знайшлі сабе пастаянны прытулак ды пачалі арганізоўваць так сваё асабістае жыцьцё і культурную ды палітычную дзейнасьць...


Беларускія Эмігранты ў Аўстраліі

Эміграцыя беларусаў у гэтую, магчыма найдалейшую ад Беларусі, краіну пачалася ў 1948-м годзе, калі спачатку невялікая колькасьць самотных хлопцаў і дзяўчат, а пасьля і цэлыя сем'і пачалі прыезжаць у галоўныя гарады, у якіх яны пераважна і засталіся на сталае жыцьцё...

Што тычыцца веды пра Беларусь, дык у Аўстраліі панавала яшчэ большая яе адсутнасьць, ніж ў Эўропе, і прыходзілася выдаваць вялікія высілкі, каб паясьніць (не заўсёды з посьпехам), што Беларусь ёсьць асобная і багатая гісторыяй і культурай нацыя... Бяручы пад увагу гэтую амаль-што татальную адсутнасьць веды пра Беларусь, магчыма няма нічога дзіўнага ў тым, што вялікая частка прыехаўшых у Аўстралію беларусаў не мела дастаткова нацыянальнай сьведамасьці і адвагі, каб супрацьставіцца гэтым труднасьцям. І вельмі шмат беларусаў проста «папрападалі» і доўгі час не прызнаваліся, што яны беларусы.

Вось такое «сцэнарыё» спаткала эмігрантаў па прыездзе ў гэтую вялікую і багатую натуральнымі рэсурсамі кантэнэнт-краіну. Па прыездзе ў Аўстралію адразу адчулася вялікая патрэба свайго згуртаваньня, і ў кастрычніку 1950 г. у г. Сыднэй было арганізаванае Беларускае Аб'еднаньне Аўстраліі з галоўнымі аддзеламі ў г. Сыднэй і ў г. Мэльборн, з сядзібай Галоўнай Управы ў г. Сыднэй.

На вялікі жаль, пасьляваенны падзел беларускай эміграцыі ў Эўропе скора паўстаў і сярод беларусаў Аўстраліі. Рэзультатам было



Соня Марчэнка ідзе на прывітаньне губернатара штату Новы Паўднёвы Уэльс падчас міжнароднага вечара у 1958 годзе

БЕЛ-ЧЫРВОНА-БЕЛЫМ


тое, што даўжэйшы час арганізацыя існавала толькі на паперы і карыснай для грамадзкасьці дзейнасьці не праводзілася і дайшло нават і да таго, што беларусы неахвотна прыходзілі на свае нацыянальныя Сьяткаваньні. Такая сумная сытуацыя панавала ў Сыднэі аж да паловы 1953-га году, калі туды прыехаў на сталае жыцьцё Сп. Алесь Алехнік. Ён адразу перайняў становішча Сакратара Беларускага Аб'еднаньня Аўстраліі, паставіў занядбаную поўнасьцю да гэтага часу справу вонкавай рэпрэзэнтацыі і ўсьведамленьня аўстралійскіх урадавых і палітычных лідараў пра Беларусь на 1-ы нумар прыярытэту...

У скорым часе былі навязаныя добрыя лучнасьці з арганізацыямі другіх нацыянальнасьцяў: палякамі, літоўцамі, мадзярамі, славакамі, баўгарамі, харватамі і др. Пачалі быць наладжваныя міжнародныя дэманстрацыі-паходы эмігрантаў з паняволеных камуністамі краінаў па г. Сыднэй і, пазьней, па Канбэры... Прыемна было бачыць, як невялікая беларуская група, амаль-што заўсёды складаючаяся з Апанаса і Алеся Алехнікаў, Міхася і Рэні Зуяў, бацькоў і ўсёй сямейкі Уладзіміра Пацко, Мікалая Пацко з жонкай ды з (беларускім фатаграфам) Міхасём Мілеўскім і Янкам Юхневічам з жонкай, заўсёды мела гонар быць на самым перадзе міжнароднай калёны з сваім Бел-Чырвона-Белым сьцягам ды з надпісам «Беларусь»... Алесь пачаў браць удзел у розных міжнародных мітынгах, выступаць з інфармацыйнымі прамовамі пра Беларусь. Ён таксама выступаў з антыкамуністычнымі прамовамі ад імя ўсіх паняволеных народаў перад былай савецкай амбасадай у Канбэры...

Адначасова пачалася акцыя па заахвочваньню беларусаў варочацца да беларускага асяродзьдзя і далучацца да працы Беларускага Аб'еднаньня. У скорым часе быў арганізаваны ў г. Сыд[illegible] Беларускі Мяшаны Хор пад кіраўніцтвам Сп.А. Анічкава, танцавальны гурток і гурток мастацкай самадзейнасьці, які з вялікімі посьпехамі ставіў п'есы: «Паўлінка», «Пінская шляхта», «На Папасе» і іншыя. Пачаліся арганізоўвацца рэгулярныя Беларускія танцы (вечарынкі) і пачаў выходзіць часопіс «Новае жыцьцё».

